# АСАБЛІВАСЦІ ПАХАВАЛЬНАЙ ПРАКТЫКІ НАСЕЛЬНІЦТВА ПОЛАЦКА Ў XVII ст.

*Чараўко В.У.*
*(г. Полацк, Рэспубліка Беларусь)*

У гісторыі Беларусі перыяд XVI–XVII стст. адзначаны шэрагам палітычных, сацыяльных, канфесійных працэсаў, якія аказалі істотны ўплыў на ўсе бакі жыцця тагачаснага грамадства. Іх уздзеянне адчувалася нават у такой кансерватыўнай сферы, як пахавальны абрад. Войны і міжканфесійная барацьба непасрэдна або ўскосна ўплывалі на пахавальную практыку, уносячы ў яе новыя элементы.

З апошніх дзесяцігоддзяў XVI ст. набыў актуальнасць канфесійны фактар развіцця пахавальных помнікаў. Ускладненне рэлігійнай структуры насельніцтва суправаджалася заснаваннем асобных могілак для розных канфесій [16, с. 111]. Да Лівонскай вайны абсалютная большасць палачан была праваслаўнай. На момант вяртання горада большасць мураваных цэркваў была разбурана. Царкоўныя ўладанні пацярпелі ад вайны. Перадача Стэфанам Баторыем маёмасці большасці праваслаўных цэркваў і манастыроў езуітам ды дзяржаўнае спрыянне каталіцкай канфесіі стварыла ўмовы для актыўнага развіцця апошняй [16, с. 80].

Узнікненне вядомых нам каталіцкіх некропалей у Полацку звязана з дзейнасцю езуітаў. У канцы XVI ст. недалёка ад перададзенага ў іх уладанне Спаса-Еўфрасінеўскага манастыра яны заснавалі Ксавер'еўскія могілкі [16, с. 83, 115]. Яшчэ адзін каталіцкі некропаль дзейнічаў каля касцёла Паднясення Святога Крыжа ў Плігаўках (XVII–XVIII стст.) і размяшчаўся на ўсход ад Ніжняга замка каля вуліц Плігаўскай, Прабойнай і Крыжовай [16, с. 81, 83–84, мал. 36, 38]. Могілкі на полацкім гарадзішчы, да-

следаваныя Д.У. Дукам і М.В. Клімавым, выкарыстоўваліся шляхтай каталіцкага веравызнання ў XVII–XVIII стст. [16, с. 112; 21, с. 29–30]. У XVIII ст. узнік некропаль каля Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст., ператворанай езуітамі ў касцёл [25, с. 48]. XVIII ст. датуюцца даследаваныя С.В. Тарасавым і М.В. Клімавым пахаванні каля дамініканскага кляштара [16, с. 113; 21, с. 30–31].

У 1596 г. праваслаўны епіскапат Рэчы Паспалітай падпісаў з каталіцкім касцёлам Брэсцкую унію. Падтрымка яе дзяржаўнай уладай пры непрыняцці большасцю праваслаўнага духавенства і міран прывялі да абвастрэння канфесійных адносін, у тым ліку да змагання за культавыя будынкі. Сітуацыя ўскладнялася тым, што праваслаўны бок на нейкі час апынуўся без уласнай іерархіі і юрыдычна павінен быў падпарадкоўвацца ранейшым архірэям, якія прынялі унію. Асаблівую вастрыню супрацьстаянне прыхільнікаў і праціўнікаў царкоўнай уніі набыло ў пачатку 1620-х гг. Полацкая царква на рове з могілкамі пры ёй адышлі да ўніятаў. Гэта суправаджалася канфліктамі паміж імі і праваслаўнымі [16, с. 114].

У 1621 г. дайшло да адкрытых сутыкненняў праваслаўнага насельніцтва і слуг архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча. Палачанін Пётр Васільевіч разам з сынам пахаваў на могілках пры царкве Ражаства Хрыстова свайго ўнука. Пахаванне адбылося «свавольна», без удзелу духавенства. Па словах Пятра Васільевіча, «попá на провод тела внука моего не упросили есмо, проводи́ть и звонить не хотел» [7, с. 119–120]. Відаць, уніяцкі святар адмовіўся праводзіць пахавальную цырымонію для дызунітаў, а праваслаўнага святара ў горадзе не было. Дазнаўшыся аб «свавольстве», полацкі ўніяцкі архіепіскап Іасафат Кунцэвіч загадаў святару і сваім слугам выкапаць цела памерлага дзіцяці і здзейсніць неабходныя абрады. Пётр Васільевіч з сынам і «многими помочниками своими», «нашедши кгвалтом» на могілкі, перашкодзілі выканаць распараджэнне архіепіска-

па [7, с. 120]. Падкрэслім высокае службовае становішча Пятра Васільевіча, які з'яўляўся полацкім лентвойтам. На Варшаўскім сейме 1623 г. паслы полацкай шляхты казалі пра спробы парушыць праваслаўныя пахаванні па загадзе Іасафата Кунцэвіча ў 1622 г. [4, с. 401]. Магчыма, падобныя інцыдэнты адбываліся неаднаразова, але ў любым выпадку былі нехарактэрнымі для рэгіёна, выключнымі і адзінкавымі дзеяннямі.

Уніятам былі перададзены і старыя праваслаўныя могілкі каля Сафійскага сабора, якія фігуравалі ў граматах вялікіх князёў Аляксандра Казіміравіча 1499 і 1501 гг. і Жыгімонта I 1544 г. [1, с. 402–403; 4, с. 131; 25, с. 160–161, 177]. У чарговы раз могілкі згаданы амаль праз стагоддзе, у інвентары жаночага базыльянскага манастыра 1637 г., што быў складзены ў час перадачы манастыра святой Сафіі уніятам [16, с. 113; 20, с. 16–18]. Некалькі пахаванняў каля Сафійскага сабора ўскрыта ў пачатку XX ст. П.П. Пакрышкіным [22, с. 82]. Могілкі ў XVII ст. існавалі таксама і каля ўніяцкіх цэркваў Святога Мікалая і Святога Георгія на Экіманскім пасадзе Полацка [15, с. 87–89; 16, с. 88–89; 17, с. 116–117].

У 1633 г. Уладзіслаў IV даў дазвол на заснаванне праваслаўнага манастыра пры Богаяўленскай царкве ў Полацку. На гэтай пляцоўцы ўжо існавалі могілкі [16, с. 113], а сама царква вядома з пачатку XVI ст. [23, с. 442]. Драўляны храм брацкага манастыра пачаў выконваць функцыі прыходскага для праваслаўных вернікаў [13, с. 200–201]. Быць пахаванымі «пры царкве святога Богаяўлення» ў 1656–1657 гг. завяшчалі мяшчане Аўдоцця Гаўрылаўна Сямёнаўная Табаровая, Фёдар Якаўлевіч Запека і Таццяна Якаўлеўна Амельянавая Шараметавая – маці Сімяона Полацкага [14, с. 47; 23, с. 547–548, 636–637, 678–682].

Ваенныя падзеі XVII ст., ад якіх моцна пацярпеў Полацк, прыводзілі да змен у гарадской тапаграфіі і змянялі баланс сіл ва ўзаемадзеянні канфесій. Так, згаданыя могілкі

пры царкве Ражаства Хрыстова пачалі актыўна пашырацца пасля ўзяцця Полацка Іванам IV або Стэфанам Баторыем і дзейнічалі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. Яны ўжо існавалі на момант пачатку будаўніцтва езуіцкага калегіума паміж Верхнім замкам і горадам (1589) [27, с. 16, 19]. З пачаткам вайны 1654–1667 гг., калі езуіты пакінулі Полацк, мясцовыя жыхары пачалі хаваць памерлых на прылеглых да могілак езуіцкіх уладаннях [16, с. 114].

У 1657 г. могілкі каля царквы Ражаства Хрыстова ўзгаданы ў тэстаменце Лаўрына Бялькоўскага [23, с. 671]. Дакумент складзены ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай, калі Полацк быў заняты расійскімі войскамі. З улікам канфесійнай палітыкі Аляксея Міхайлавіча на беларускіх землях («жидам в Белой Руси не быть», «униатам не быть», «костёлам не быть, а петь в домех») [12, с. 84], трэба разумець, што ў гэты час царкву разам з могілкамі вярнулі праваслаўнай канфесіі. У 1660–1670-х гг. храм быў разбураны, а могілкі – закінуты. Пасля вяртання езуітаў яны качаткова перапынілі існаванне. У выніку скарачэння насельніцтва горада ў час вайны больш чым у 10 разоў была страчана нават памяць аб іх. У канцы XVII–XVIII ст. могілкі былі часткова забудаваны карпусамі калегіума [16, с. 80, 114, 148; 27, с. 19]. У слаях XVI–XVII стст. Д.У. Дукам знойдзены фрагменты некалькіх дзясяткаў касцякоў, пераважна моцна пашкоджаных [19, с. 14–15].

З'яўляючыся элементам гарадской тапаграфіі, некропалі адмяжоўваліся ад астатняй гарадской прасторы. Павіннасць агароджваць «цвінтар» каля Сафійскага сабора ў канцы XV–XVI ст. неслі жыхары трох вёсак (Далчане, Веснічане і Пуцілкавічы). Можна меркаваць, што такая практыка склалася яшчэ ў канцы XIV ст. [4, с. 131; 24, с. 160–161, 177]. Павіннасць прадугледжвала не толькі пабудову плота, але і падтрыманне яго ў належным стане. Пры гэтым гарадскія могільнікі маглі размяшчацца літаральна ўшчыльную да манастырскіх і прыватнаўласніцкіх

сядзіб. Відаць, яны ўспрымаліся насельніцтвам як звыклая частка гарадской прасторы. Праз могілкі можна было ісці па сваіх справах [11, с. 207]. Інвентар полацкага базыльянскага манастыра 1637 г. згадвае манахінь, якія праз могілкі хадзілі ў Сафійскі сабор з манастырскіх будынкаў [20, с. 16]. Інвентар маёмасці полацкай архіепархіі 1618 г. апісвае агарод, размешчаны пры віцебскай сядзібе архіепіскапа «подле цвинтаря» [6, с. 344].

Палачан маглі хаваць не толькі на грунтавых могілках, але і ўнутры храмаў, што вынікае з мяшчанскіх тэстаментаў. Калі маці Сімяона Полацкага Таццяна Якаўлеўна Шараметава прасіла пахаваць яе «*пры* царкве Святога Богаяўлення» [14, с. 47; 23, с. 678–682], то Арына Лукашэвічава і Настасся Паўкова хацелі быць пахаваны *ўнутры* царквы (Настасся Паўкова – у прытворы) [23, с. 563–564, 576–577]. Богаяўленскі сабор у сярэдзіне XVII ст. быў драўляным і не меў скляпоў, таму размова ідзе пра пахаванні пад падлогай. Адзначым, што вядомыя нам пахаванні ў храмах XII–XIII стст. звязаны з мурав珠нымі пабудовамі.

Пахаванні ў скляпах мураваных храмаў у часы позняга сярэднявякоўя – ранняга Новага часу ў Полацку вядомы з XVI ст. Паводле тэстамента Станіслава Бажымоўскага (1652), ён мусіў быць пахаваны ў склепе ў полацкіх езуітаў [8, с. 15; 9, с. 54]. Да гэтага ж часу адносіцца жаночае пахаванне, знойдзенае ў падвале Сафійскага сабора ў Полацку. На падставе знаходкі манеты яно датуецца XVI – пачаткам XVII ст. [2, с. 131]. З падвала Сафійскага сабора паходзіць і пахаванне мужчыны XVII–XVIII стст., рэканструкцыя твару якога зроблена І.У. Чаквіным [28, с. 58, мал. 33].

Як і ў старажытнарускі перыяд, на пахаванне ў храмах магла прэтэндаваць грамадская эліта. Арына Лукашэвічава была ўдавой полацкага бурмістра, Таццяна Шараметава – райцы; райцам з'яўляўся і сын Настассі Павуковай [16, с. 114; 23, с. 563, 577]. Не выключана, што заможныя і ўплывовыя кцітары-мяшчане маглі мець у храмах сямей-

ныя ўчасткі для пахавання. На такую думку наводзяць просьбы Арыны Лукашэвічавай пахаваць яе каля магілы мужа Лук'яна Лукашэвіча, а Станіслава Бажымоўскага – каля памерлай жонкі [8, с. 15; 9, с. 54; 23, с. 564]. Вызначэнне ў тэстаментах асоб, адказных за пахаванне, раскрывае яшчэ адзін аспект узаемаадносін паміж роднымі і блізкімі. Непасрэдны ўдзел бліжэйшых сваякоў у арганізацыі пахавання прадугледжваўся традыцыяй. У тэстаменце Таццяны Якаўлеўны Шараметавай гэты клопат ускладаецца на сыноў, паколькі гэта «прыналежыт» сынам, «матку сваю мілуючым» [10, с. 47].

Прадстаўнікі вышэйшага духавенства маглі знайсці апошні спачын у нішах, зробленых у храмавых сценах. Так, у 1714 г. пры абрушэнні ў час рамонту сцяны Сафійскага сабора рабочыя знайшлі пахаванне архірэя. Складальнік дзённіка ўніяцкага Сафійскага сабора меркаваў, што яно належала епіскапу Гедэону Бральніцкаму. Статус памерлага падкрэслівалі архірэйскія строі, якія ўключалі асаблівыя дэталі вопраткі (сакас, амафор, параман, крыж-рэлікварый і г. д.) [3, с. 343].

Пахавальная вопратка мяшчан была больш сціплай і адпавядала іх сацыяльнаму статусу. Так, Настасся Павуковая прасіла апрануць яе ў чорную сукенку [23, с. 577]. Цела памерлага накрывалі пакрывалам. Таццяна Шараметава ў 1657 г. прасіла пакрыць труну «па звычаю» «абрусом лепшым ткацкім», які спецыяльна падрыхтавала для гэтага [10, с. 47; 23, с. 678–682]. Жаночае пахаванне XVI–XVII стст. з Сафійскага сабора ўтрымлівала фрагмент шаўковага пакрывала з вышытым тэкстам акафіста Маці Боскай [18, мал. 124].

Як нехарактэрны для тагачаснай практыкі прыклад можа разглядацца пахаванне Іасафата Кунцэвіча, якое мусіць трактавацца як *«дэвіянтнае»* [5, с. 14]. У час віцебскага паўстання 1623 г. ўніяцкі епіскап быў забіты, а яго цела ўтоплена, што не суадносіцца з хрысціянскай традыцыяй.

Неўзабаве цела было знойдзена ў Дзвіне і пахавана ў падвале полацкага Сафійскага сабора. Прыкладна праз год астаткі Іасафата Кунцэвіча былі вынуты з зямлі і змешчаны ў сярэбраную ра́ку, пастаўленую ў інтэр'еры Сафійскага сабора [26, с. 13]. Такая традыцыя пахавання таксама не характэрна для Падзвіння, але знаходзіць паралелі ў практыцы размяшчэння мошчаў святых. У ёй трэба бачыць намаганні ўніяцкай царквы па стварэнні лакальнага культу Іасафата Кунцэвіча і яго кананізацыі. Сапраўды, ужо ў 1628 г. папа рымскі прызначыў камісараў для збору звестак аб жыцці, смерці і аб цудах гэтага «всехвалного мужа Божага», якія пачалі апытваць віцяблян. Урэшце Кунцэвіч быў беатыфікаваны ў 1643 г. [7, с. 126–127; 26, с. 13]. У далейшым ра́ка з яго целам неаднаразова перавозілася з месца на месца ў сувязі з войнамі Расіі з Рэччу Паспалітай [26, с. 14–15].

Такім чынам, у XVII ст. месцам апошняга спачыну палачан пераважна станавіліся грунтавыя некропалі. Прадстаўнікоў гарадской вярхушкі маглі хаваць пад падлогай драўляных ці ў скляпах мураваных храмаў, вышэйшае духавенства – у нішах, зробленых у храмавых сценах. Пажаданні мяшчан адносна абставін уласнага пахавання (месца, вопратка, месца) маглі змяшчацца ў тэстаментах. Ускладненне канфесійнай структуры грамадства паўплывала на дыферэнцыяцыю могілак, якія замацоўваліся за католікамі, уніятамі, праваслаўнымі. Сацыяльная і канфесійная палярызацыя грамадства магла прыводзіць да парушэння пахавальных традыцый, што бачна на прыкладзе Іасафата Кунцэвіча. Некропалі маглі пераходзіць ад адной канфесіі да другой, што суправаджалася сутыкненнямі. Спусташальная вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. разам са спадарожнымі рабаўніцтвам, голадам і эпідэміямі выклікалі скарачэнне насельніцтва Полацка і змены ў яго тапаграфіі, што прыводзіла да заняпаду старых і з'яўлення новых могілак.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Акты**, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией : [в 5 т.]. – Санкт-Петербург : в Типографии Э. Праца, 1846–1853. – Т. 2 : 1506–1544. – В типографии II Отделения собственной Е. И. В. Канцелярии, 1848. – III с. + 405 с. + 15 с. + 14 с.

2. **Археалогія** Беларусі : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 1997–2001. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд.: В. М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с. ; іл.

3. **Археографический** сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси : [в 14 т.]. – Вильна : В типографии О. Блюмовича, 1874. – Т. 10. – VIII с. + 392 с.

4. **Белоруссия** в эпоху феодализма : сб. материалов и документов : в 3 т. / АН БССР, ин-т истории, Архивное упр. МВД БССР. – Минск : АН БССР, 1959. – Т. 1 : С древнейших времён до середины XVII в. – 516 с.

5. **Берсенева, Н. А.** Подходы к интерпретации «девиантных» погребений в археологии [Электронный ресурс] / Н. А. Берсенева // Развитие взглядов на интерпретацию археологического источника : материалы Всероссийской научн. конф. / отв. ред. Д. С. Коробов. – Москва : Институт археологии РАН, 2016. – С. 13–14. – Режим доступа: www.archaeolog.ru/media/konf_2016/interpret-tezis.pdf. – Дата доступа: 12.05.2019.

6. **Витебская** старина : [в 5 т.] / сост. А. П. Сапунов. – Витебск : В типографии губернского правления, 1883–1888. – Т. I. – XXII с. + 668 с. ; ил.

7. **Витебская** старина : [в 5 т.] / сост. А. П. Сапунов. – Витебск : В типографии Витебского губернского правления, 1883–1888. – Т. V, ч. I. – 6 с. + CLXVII с. + 650 с. + XX с. ; ил.

8. **Галубовіч, В. У.** Каталіцкая царква ў Полацкім ваяводстве ў канцы XVI – першай палове XVII стагоддзя / В. У. Галубовіч // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2013. – № 1. – С. 13–17.

9. **Галубовіч, В. У.** Шляхта польскага паходжання ў Полацкім ваяводстве ў канцы XVI–XVII стст. / В. У. Галубовіч // Матэрыялы гіст.-краязн. канф. : да 80-годдзя Полацкага краязнаўчага музея,

Полацк, 22–23 лістапада 2006 г. / уклад. В. Д. Краско. – Полацк : НПГКМЗ, 2008. – С. 47–55.

10. **Гардзееў, М.** Тэстамент маці Сімяона Полацкага / М. Гардзееў // Беларускі горад у часе і прасторы : 500 гадоў Полацкай Магдэбургіі : зб. навук. прац / ПДУ, Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Наваполацк : ПДУ, 2001. – С. 87–97.

11. **Гістарычны** слоўнік беларускай мовы / АН СССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Вып. 36. Фолкга – чорногрывый / склад. А. М. Булыка [і інш.] ; пад рэд. А. М. Булыкі. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 437 с.

12. **Гісторыя** Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Соврем. шк. : Экоперспектіва, 2007–2011. – Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 344 с. ; іл.

13. **Гліннік, В.** Полацкія саборныя цэрквы (X – XX стст.) / В. Гліннік // Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай Магдэбургіі : зб. навук. прац / ПДУ, Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Наваполацк, 2001. – С. 198–205.

14. **Гордеев, М. Ю.** Новые данные к биографии Симеона Полоцкого: завещание матери просветителя / М. Ю. Гордеев // Славяноведение. – 1999. – № 2. – С. 37–47.

15. **Дук, Д. У.** Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX–XVIII стст. (па выніках раскопак 2004–2012 гг.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – 248 с. ; іл.

16. **Дук, Д. У.** Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с. ; іл.

17. **Дэйніс, І. П.** Полацкая даўніна / І. П. Дэйніс. – Мінск : Медисонт, 2007. – 330 с. ; іл.

18. **Дэкаратыўна-прыкладное** мастацтва Беларусі XII–XVII стагоддзяў / аўт. тэксту і склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1984. – 235 с. ; іл.

19. **Емельянчик, О. А.** Новые материалы к антропологическому изучению населения Полоцка XVII–XVIII вв. / О. А. Емельянчик // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац Міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 21–23 красавіка 2011 г. : у 2 ч. / пад агул. рэд.: Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 14–21.

20. **Историко-юридические** материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской : [в 32 вып.]. –

Витебск : Типография Губернского правления, 1871–1906. – Вып. 29. – IV с. + 472 с. + 48 с. +XXXI с.

21. **Клімаў, М. В.** Археалагічныя даследаванні гарадзішча і Вялікага пасада Полацка ў 2009 г. / М. В. Клімаў // Середньовічні міста Полісся : тези доповідей міжнародної наукової археологічної конференції. – Київ ; Олевьск, 2011. – С. 29–31.

22. **Полоцк.** Археологические раскопки // Известия императорской археологической комиссии. Прибавление к вып. 52-му. – Санкт-Петербург : Типография главного управления уделов, 1914. – С. 82–83.

23. **Полоцк:** Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Беларуская навука, 2012. – 743 с. ; ил.

24. **Полоцкие** грамоты XIII – начала XVI в. / сост. А. Л. Хорошкевич. – Москва : Институт истории СССР, 1977–1990. – Вып. II. – 1978. – 220 с.

25. **Предварительные** результаты археолого-архитектурных исследований на территории Спасо-Преображенского храма Спасо-Евфросиньевского монастыря в городе Полоцке в 2018 г. / И. В. Магалинский [и др.] // Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов : сб. науч. работ Междунар. науч.-практ. конф. к 50-летию Полоцкого гос. ун-та, Новополоцк, 18–19 октября 2018 г. / под общ. ред.: В. Е. Овсейчика (отв. ред.), Г. И. Захаркиной, Р. М. Платоновой. – Новополоцк : ПГУ, 2018. – С. 45–50.

26. **Сапунов, А.** Полоцкий Софийский собор / А. Сапунов. – Витебск : В типографии губернского правления, 1888. – 21 с. ; ил.

27. **Соловьёв, А. А.** Полоцкий иезуитский коллегиум в ретроспективе (1581–1914) : архитектурно-археологический очерк / А. А. Соловьёв. – Полоцк : Полоцкое книжное издательство, 2012. – 97 с. ; ил.

28. **Цягака, Л. І.** Магчымасці палеаантрапалагічных рэканструкцый / Л. І. Цягака // Беларусы. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – [Т.] 9 : Антрапалогія. – С. 52–72.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛАЦКІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ
МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК

*Да 390-годдзя
Сімяона Полацкага*

# СІМЯОН ПОЛАЦКІ: СВЕТАПОГЛЯД, ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І ЛІТАРАТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі
21–22 лістапада 2019 г.

Мінск
Нацыянальная бібліятэка Беларусі
2019

УДК 008(476)(092)(06) + 821.161'04.09(092)(06)
ББК 63.3(4Беи)51,8я431 + 83.3(2=411)5-8я431
С37

Укладальнік
С. В. Гаўрылава

С37 **Сімяон Полацкі:** светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць : да 390-годдзя Сімяона Полацкага (матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі 21–22 лістапада 2019 г.). – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2019. – 242 с.
ISBN 978-985-7235-13-1

Зборнік змяшчае матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 390-годдзю Сімяона Полацкага, якая адбылася ў лістападзе 2019 г. у Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі запаведніку.

**УДК 008(476)(092)(06) + 821.161'04.09(092)(06)**
**ББК 63.3(4Беи)51,8я431 + 83.3(2=411)5-8я431**

**ISBN 978-985-7235-13-1**

© Гаўрылава С. В., 2019
© Афармленне. Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2019

# Змест

**БАРОЎКА В. Ю.**
Эстэтычная мемарыялізацыя асобы Сімяона Полацкага ў творах беларускіх паэтаў другой паловы XX – пачатку XXI ст. .......... 5

**БОЖКО Т. В.**
Фунеральный латиноязычный панегирик XVII в. как средство репрезентации и трансляции символического капитала .......... 15

**ГАЛУБОВІЧ В. У.**
Антоні Сялява vs полацкія мяшчане: абставіны і верагоднасць гісторыі замаху на жыццё архіепіскапа ў 1633 г. .......... 29

**ГАЎРЫЛАВА С. В.**
Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага як унікальная мемарыяльная прастора .......... 43

**ДЗЕНІСЕНКА А. П.**
Выданні па гісторыі Полацка XVI–XX стст. «Miesięcznik Połocki» ў фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі .......... 48

**ДЗЯРНОВІЧ А. І.**
«Слоўнік палона-славенскі» Сімяона Полацкага і фармаванне славістычнай калекцыі Упсальскага ўніверсітэта .......... 61

**ДИЛИГУЛ Е. С.**
Сказание о Тихвинской иконе Богоматери в творчестве Симеона Полоцкого .......... 72

**ЖУКОВ А. Е.**
Еще раз к вопросу об исторических обстоятельствах создания Супрасльского сборника 1507 г. .......... 79

**ЗВОНАРЁВА Л. У.**
Европейские авторитеты в ранней поэзии Симеона Полоцкого .......... 95

**ИГНАТОВ В. К.**
Творчество Симеона Полоцкого в контексте европейской культуры эпохи барокко .......... 106

**КАЛЕЧИЦ И. Л.**
Граффити полоцкой Спасо-Преображенской церкви «периода переосвящения» (1656–1667) .......... 123

**КОМЛІК М. А.**
Чалавек іншай веры ў мемуарах Мікалая Крыштофа Радзівіла
і Саламеі Пільштыновай ........................................133

**КОЦ А. Л.**
Пабудова першай паловы XVII ст. з раскопак 2016 г.
на Верхнім замку ў Полацку ........................................140

**ЛЯВОНЕНКА Г. Ю.**
Вобраз старога чалавека ў творы Яна Пратасовіча
«Konterfet człowieka starego»........................................152

**МАГАЛІНСКІ І. У.**
Тэхналогія вытворчасці полацкіх ювеліраў XVII ст. ..................159

**ПРЕОБРАЖЕНСКАЯ А. А.**
Источники проповедей Симеона Полоцкого:
перевод, пересказ, адаптация........................................166

**РАКИТЯНСКИЙ А. Т.**
Симеон Полоцкий (1629–1680) и книжность середины XVII в. ......179

**САНДАЛАВА Т. А.**
Коды ў паэтычных эксперыментах Сімяона Полацкага ..............186

**СМИРНОВА Е. А.**
Евангелие Василия Тяпинского ........................................201

**ТРИФОНОВА Н. Я.**
Полоцк в русско-белорусских культурных связях
второй половины XVII в. ........................................214

**ФІЛІМОНАВА В. А.**
Беларускія лаціна-польскія выданні XIX ст. у фондах
Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага
музея-запаведніка ........................................218

**ЧАРАЎКО В. У.**
Асаблівасці пахавальнай практыкі насельніцтва
Полацка ў XVII ст. ........................................228

**Звесткі аб аўтарах** ........................................238

Навуковае выданне

# СІМЯОН ПОЛАЦКІ: СВЕТАПОГЛЯД, ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І ЛІТАРАТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі
21–22 лістапада 2019 г.

*На беларускай, рускай мовах*

Укладальнік **Гаўрылава** Славіна Вячаславаўна

Карэктары
В. Я. Ашуева, Н. Я. Анапрэенка,
К. І. Вяргейчык-Лабецкая, А. У. Хадакоўская

Камп'ютарная вёрстка і дызайн Д. В. Макарэвіча

Падпісана ў друк 24.12.2019. Фармат 60x84$^{1}/_{8}$. Гарнітура Cambria.
Лічбавы друк. Умоўн. друк. арк. 6,04. Улік. выд. арк. 9,75. Тыраж 100 экз. Заказ 924.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/398 ад 02.07.2014.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/157 ад 02.07.2014.

Пр. Незалежнасці, 116, 220114, Мінск.
Тэл. (+375 17) 293 27 68. Факс (+375 17) 266 37 23. E-mail: edit@nlb.by.